Пярэчанні
на скаргу ініцыятараў стварэння Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Наша Вясна" на адмову Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у дзяржаўнай рэгістрацыі гэтай арганізацыі

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст) не можа пагадзіцца з довадамі скаргі ініцыятараў стварэння Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Наша Вясна" (далей – ГПА).

У Мінюст 25.04.2009 сапраўды паступілі матэрыялы, што маюць дачыненне да дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА. Пры іх вывучэнні было ўстаноўлена наступнае.

Па-першае, шэраг дасланых рэгіструючаму органу дакументаў нельга прызнаць юрыдычна значнымі. Гэта звязана з наступнымі акалічнасцямі.

Так, насуперак патрабаванню дадатка 2 да пастановы Міністэрства юстыцыі ад 30.08.2005 №48 "Аб зацвярджэнні нарматыўных прававых актаў па пытаннях афармлення і разгляда дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур" з далейшымі змяненнямі і дапаўненнямі, ў спісе заснавальнікаў ГПА ўказаны звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці або з'яўляюцца скажонымі, і тычацца Ваўранюка В.У., Маслюковай А.А., Нікалаева А.В., Салаўёва Д.С.

Доказы абаснаванасці вывадаў Мінюста суду прадстаўлены, яны маюцца сярод матэрыялаў судовай справы.

Прымаючы да ўвагі пералічанае, дасланы дакумент пад назваю "Спіс заснавальнікаў Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Наша Вясна" нельга прызнаць юрыдычна значным. З гэтай нагоды неабходна лічыць, што ў Мінюст фактычна не прадстаўлены прадугледжаны арт.13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей – Закон) як абавязковы спіс заснавальнікаў грамадскага аб'яднання.

Названая акалічнасць згодна з абзацам чацвёртым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Другая частка назвы ГПА ("Наша Вясна") не адпавядае статуту гэтай арганізацыі. Так, у статуце ГПА няма ніводнага палажэння, якое б сведчыла аб сувязі азначанай часткі назвы дадзенай арганізацыі з памянёным праваўстаноўчым дакументам гэтага грамадскага аб'яднання.

Сцвярджэнне прадстаўніка кіруючага органа ГПА Лабковіча У.М. у судзе, якое ён зрабіў 16.07.2009, наконт таго, што "Наша Вясна" ў

уласная назва арганізацыі, не грунтуецца на заканадаустве. Гэты прадстаўнік кіруючага органа ГПА не змог назваць ні адну норму права, якая б пацвердзіла правільнасць яго пункта гледжання.

Затое ёсць іншая норма Закона: неадпаведнасць назвы грамадскага аб'яднання яго статуту згодна з абзацам пятым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

У Мінюста ўзніклі сумненні адносна гарантыйнага ліста, падпісанага асобай па прозвішчу Салаўёў Д.С., а таксама стана памяшкання, якое гэтая асоба збіралася прадаставіць ГПА для размяшчэння яго кіруючага органа.

Каб развеяць узнікшыя сумненні, было вырашана наведаць азначанае памяшканне, каб ацаніць, ці ў стане яно быць выкарыстаным у якасці месца размяшчэння кіруючага органа ГПА, для размяшчэння дакументацыі арганізацыі і інш. Таму Мінюстам быў накіраваны ліст Наваполацкаму гарадскому выканаўчаму камітэту ад 15.05.2009 №06-12/341 (копія прадстаўлена суду) з адпаведнымі просьбамі.

Атрыманы Мінюстам адказ з Наваполацкага гарадского выканаўчага камітэта ад 19.05.2009 №01-12/1258 (яго копія ёсць сярод матэрыялаў справы) сведчыць аб тым, што агледзець памяшканне не ўдалося, бо краты ўваходных дзвярэй былі замкнёнымі. Пры размове ж па мабільнаму тэлефону Салаўёў Д.С. катэгарычна адмовіўся прадаставіць магчымасць адпаведнаму супрацоўніку Наваполацкага гарвыканкама агледзець памяшканне, якое ён збіраўся прадаставіць ГПА пад юрыдычны адрас, з мэтаю ўдакладнення, наколькі гэтае памяшканне ў стане быць вакарыстаным па прызначэнню. Выказванні Лабковіча У.М. у судзе 16.07.2009 былі бяздоказнымі.

Маюцца таксама іншыя дакументы, якія перададзены суду.

З улікам пералічаных акалічнасцяў Мінюст не можа прызнаць памянёны гарантыйны ліст як юрыдычна значны дакумент, які б мог пацвердзіць наяўнасць у ГПА юрыдычнага адраса. Таму трэба лічыць, што рэгіструючаму органу не прадстаўлены абавязковы дакумент, прадугледжаны арт.13 Закона, які б мог пацвердзіць наяўнасць у грамадскага аб'яднання юрыдычнага адраса. Гэтая акалічнасць згодна з абзацам чацвёртым часткі трэцяй арт.15 Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Апрача гэтага, згодна са звесткамі, якія маюцца ў Мінюсце, многія з заснавальнікаў ГПА прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, шэраг з іх неаднаразова, у тым ліку за дзеянні, звязаныя з парушэннем грамадскага парадка, а таксама правоў і свабодаў іншых асобаў (суду перададзены ў якасці доказаў копіі адпаведных лістоў, якія характэрызуюць асобаў, што выступілі ініцыятарамі стварэння ГПА).

На гэтыя акалічнасці звярталася ўвага кіраўніцтва ГПА ў лісце ад 02.03.2009 №06-12/145 аб папярэдняй адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі гэтай арганізацыі (яго копія перададзена суду). Тым не менш, прозвішчы асобаў-правапарушальнікаў амаль у поўным складзе (26 прозвішчаў) зноў прысутнічаюць у спісе заснавальнікаў ГПА, што паступіў у Мінюст 25.04.2009.

Апрача таго, ёсць доказы прыцягнення некаторых асобаў, што выступілі ў якасці заснавальнікаў ГПА, да крымінальнай адказнасці.

Акрамя гэтага, у адносінах да Созінава В.Я. 08.05.2009 узбуджана крымінальная справа (сярод матэрыялаў судовай справы маецца адпаведны дакумент) за здзяйсненне ім дзеянняў, што падпадаюць пад прыкметы злачынства, адказнасць за ўчыненне якога прадугледжана арт.380 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ацэнку гэтым яго дзеянням дасць суд).

Такім чынам, каля 40% заснавальнікаў ГПА з'яўляюцца неправапаслухмянымі асобамі.

Кіруючыся абзацамі чацвёртым і пятым часткі трэцяй арт.15 Закона, Мінюстам 23.05.2009 абаснавана і законна было прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі ГПА.

Кансультант Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў
Мінюста А.П.Харытон